# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Касета. Гайда. Юпітэр. Адбор. Кадка. Рагу. Тыгр. Маляр. Брас. Дуга. Абак. Шкода. Раз. Агат. Адан. Гад. Курага. Рух. **По вертыкалі:** Айсберг. Каюр. Спіца. Трэск. Гранат. Кума. Доп. Акр. Арба. Асака. Ягада. Доза. Гора. Бог. Кат. Ангар. Джут. Агу. Дах.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.00 | 21.30 | 16.30 |
| Віцебск — | 4.42 | 21.27 | 16.45 |
| Магілёў — | 4.50 | 21.21 | 16.31 |
| Гомель — | 4.55 | 21.09 | 16.14 |
| Гродна — | 5.16 | 21.44 | 16.28 |
| Брэст — | 5.25 | 21.37 | 16.12 |

## Месяц

*Першая квадра 14 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

***Пр.** Аляксандры, Анастасіі, Вольгі, Марыі, Тацяны, Аляксея, Андрэя, Мікалая, Фёдара, Фядота, Яфіма.*
***К.** Ядвігі, Аляксея, Багдана, Марціна.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# ЗАЎТРА




## 17 ЛІПЕНЯ — Даты. Падзеі. Людзі

**У краіне**

**1796** год — нарадзіўся (в. Малюшычы, Навагрудскі павет) Ян Чачот, беларускі паэт-рамантык, філамат, філарэт, фалькларыст, этнограф і драматург; сябра Адама Міцкевіча. Паэт сабраў каля тысячы аўтэнтычных беларускіх народных песень і выдаў іх у шасці зборніках «Сялянскіх песень з-над Нёмана і Дзвіны». У сваёй прадмове ён зрабіў нарыс граматычных асаблівасцяў беларускай мовы і ўпершыню паставіў пытанне аб прынцыпах будучага «крывіцкага» правапісу.



**1919** год — спыніў сваю дзейнасць Урад Літбел ССР. Прычыны стварэння ЛітБела дагэтуль застаюцца нявысветленымі. Некаторыя гісторыкі пісалі, што «зыходзячы з абставін міжнароднага характару, ЦК РКП (б) прыняў пастанову аб аб'яднанні Мінскай і Гродзенскай губерняў з Літоўскай ССР. Тым самым як бы здымалася з парадку дня пытанне аб правамернасці далучэння ўсходніх этнічных беларускіх земляў да РСФСР». Гісторык Юрый Туронак прыводзіць словы Свярдлова аб тым, што «было імкненне ЦК забяспечыць гэтыя рэспублікі ад магчымасці праяўлення ў іх нацыянальна-шавіністычных настрояў».

**1944** год — войскамі 2-га Прыбалтыйскага фронту вызвалены г. п. Асвея Верхнядзвінскага раёна, а войскамі 1-га Беларускага фронту — г. Драгічын Брэсцкай вобласці. У гэты ж дзень падчас Беластоцкай аперацыі войскамі 1-га і 2-га Беларускіх франтоў вызвалены Свіслацкі раён Гродзенскай вобласці.

**У свеце**

**1914** год — на Алімпійскім кангрэсе ў Парыжы ў сувязі са святкаваннем 20-годдзя Алімпійскіх гульняў сучасных адбылася афіцыйная прэзентацыя алімпійскага флага: на белым палотнішчы пяць пераплеценых рознакаляровых кольцаў, якія сімвалізуюць пяць частак свету — Еўропу, Азію, Афрыку, Аўстралію і Амерыку.

**1917** год — у Петраградзе расстраляна мірная дэманстрацыя рабочых і салдат, гэтая падзея вядомая ў гісторыі як «ліпеньскі расстрэл». Ліпеньскія падзеі на нейкі час фактычна прывялі да згортвання рэжыму «двоеўладдзя»: дзякуючы сваім жорсткім метадам у ліпені Часоваму ўраду ўдалося на некалькі месяцаў адцясніць Петрасавет. Па выніках палітычнага крызісу падаў у адстаўку кіраўнік першага складу Часовага ўрада князь Г. Я. Львоў. Яго месца заняў ваенны міністр А. Ф. Керанскі, уплыў якога, такім чынам, значна ўзмацніўся. Эсэра-меншавіцкі Петрасавет прызнаў новы склад Часовага ўрада «ўрадам выратавання рэвалюцыі».

**1944** год — войскі 1-га Украінскага фронту перасеклі дзяржаўную граніцу СССР і ўступілі на тэрыторыю Польшчы. Пачалося вызваленне Польшчы савецкімі войскамі пры ўдзеле створанага на тэрыторыі СССР Народнага Войска Польскага.

**Так гаварыў...**

**ГІПАКРАТ:**

*«Перш чым узяцца каго-небудзь лячыць, варта спытаць у яго, ці гатовы ён пакінуць усё тое, што зрабіла яго хворым».*

## УСМІХНЕМСЯ

— **Якія ў вас горкія памідоры чэры!**
— **Гэта радыска...**

Сёння на прабежцы зразумеў, што можна падысці да любога чалавека, які бегае, у прынцыпе нават да незнаёмага, спытаць у яго: «Ну як твая нага?» І атрымаць разгорнуты адказ.

**Ведаеце, чаму сучасныя дзеці ўвесь час праводзяць за камп'ютарам, а мы ў двары ў іх гады гулялі ў футбол? Таму што ўвесь двор заняты вашымі аўто...**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12.118. Індэкс 63850. Зак. № 1639.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 16 ліпеня 2024 года.